***Вяткіна А. А.**, настаўніца пачатковых класаў сярэдняй школы № 22 г. п. Балбасава імя С. І. Грыцаўца Аршанскага раёна Віцебскай вобласці*

# Моўныя скарбы роднага краю

## Інтэлектуальная гульня для вучняў II класа

***Мэта:*** выхоўваць у дзяцей цікавасць да нацыянальнай культуры, любоў да Радзімы, роднай мовы; узбагачаць лексічны запас вучняў; развіваць кемлівасць, дапытлівасць.

***Эпіграф:***

Мілая, адзіная
Нам, нашчадкам, дадзена
Любаю радзімаю
Ад дзядоў і прадзедаў (*Уладзімір Мазго*)

У гульні прымаюць удзел 2 каманды.

**1. Арганізацыйны этап.**

— У свеце шмат цудоўных моў. Але ў кожнага чалавека ёсць толькі адна мова, якая завецца роднай. На гэтай мове ён размаўляе з роднымі, сябрамі, знаёмымі. Дрэнна, калі мы забываемся пра сваю мову, не шануем яе. Вельмі важна вывучаць мову свайго народа.

**2. Асноўны этап.**

— Сёння ў гульні ўдзельнічаюць каманды:

1-я каманда — «Сонейка»;

2-я каманда — «Вясёлка»;

— Усім камандам жадаем перамогі.

— За нашай гульнёй будзе назіраць журы.

***Размінка.***

1. З хаты ў хату водзіць, а сама не заходзіць. *(Дарога.)*

2. Ляжыць сярод градкі зялёны і гладкі. *(Агурок.)*

3. Есць зялёную траву і гаворыць так: «Му-Му».

Любіць грушу спелую, дае вадзіцу белую. *(Карова.)*

4. Ляжыць у вадзе бервяно,

Зубастае і злючае яно. *(Кракадзіл.)*

5. Крадзе нясушак, яйкі і гоніцца за зайкай.

Вось дык хітрая краса быццам полымя... *(Ліса.)*

6. Ляцяць птушкі без крыл, садзяцца без ног. *(Снег.)*

## 1 конкурс «Розныя літары»

— Устаўце літары ў пачатку, каб атрымаліся розныя словы.

| | | |
|---|---|---|
| | У | К |
| | У | К |
| | У | К |
| | У | К |
| | У | К |
| | У | К |
| | У | К |

*Гук, лук, бук, сук, жук, пук, хук.*

## 2 конкурс «Перакладчыкі»

— Перакладзіце на беларускую мову словы. Восем слоў для кожнай каманды.

диван — ... (*канапа*)

красивый — ... (*прыгожы*)

краски — ... (*фарбы*)

ладонь — ... (*далонь*)

кисточка — ... (*пэндзлік*)

арбуз — ... (*кавун*)

забор — ... (*плот*)

бумага — ...(*папера*)

мальчик — ... (*хлопчык*)

девочка — ... (*дзяўчынка*)

©Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа

петух — ... (*певень*)

ковёр — ... (*дыван*)

тетрадь — ... (*сшытак*)

ошибка — ... (*памылка*)

шкаф — ... (*шафа*)

деньги — ... (*грошы*)

**3 конкурс «Хованкі»**

— Знайдзіце і запішыце словы, якія схаваліся ў прыведзеных словах. Усе словы кожнай камандзе.

народ Эдзік

ножка зязюля

Піліпка маскарад

зеляніна сабака

**4 конкурс «Назаві адным словам»**

— Тром відавым паняццям знайдзіце абагульняючае слова. Па тры групы слоў кожнай камандзе.

Пчала, жук, чмель — гэта… (*насякомыя*).

Верабей, ластаўка, сарока — гэта… (*птушкі*).

Заяц, воўк, ліса — гэта… (*звяры*).

Званочак, рамонак, васілёк — гэта… (*кветкі*).

Сукенка, хустка, шапка — гэта… (*адзенне*).

Шафа, паліца, ложак — гэта… (*мэбля*).

**5 конкурс «Наадварот»**

— Назавіце слова з супрацьлеглым значэннем. Па сем слоў кожнай камандзе.

дзень — … (*ноч*)

ранак — … (*вечар*)

зіма — … (*лета*)

высока — … (*нізка*)

сумна — … (*весела*)

згубіў — … (*знайшоў*)

чысты — … (*брудны*)

сыты — … (*галодны*)

мяккі — … (*цвёрды*)

купіў — … (*прадаў*)

цяжка — … (*лёгка*)

шырокі — … (*вузкі*)

цёмна — … (*светла*)

справа — … (*злева*)

**6 конкурс «Жывы — не жывы»**

— Змяніце падкрэсленую літару так, каб з жывога атрымаўся нежывы прадмет. Усе словы кожнай камандзе.

казуля — … (*кашуля*)

мышка — … (*шышка*)

кошка — … (*дошка*)

вожык — … (*ножык*)

рак — … (*мак*)

качка — … (*тачка*)

**7 конкурс «Матэматычная граматыка»**

— Расшыфруйце словы. Па тры словы кожнай камандзе.

БАРС-С+Ы+ТОНА-А = ... (*барытон*)

КНІ+ГОЛ-ОЛ+А = ... (*кніга*)

СЛОВА-ОВА+ОЎ+НІК = ... (*слоўнік*)

СОН+ЦЫРК-ЫРК+А = ... (*сонца*)

РУКА-КА+ЖАБА-БА = ... (*ружа*)

ПАР+КАН-АН = ... (*парк*)

**8 конкурс «Рэбусы»**

— Неабходна разгадаць рэбус. Па тры рэбусы для кожнай каманды.




(*Аловак.*)

©Пачатковае навучанне: сям’я, дзіцячы сад, школа




*(Талерка.)*




*(Бульба.)*




*(Дзверы.)*




*(Канапа.)*




*(Цукар.)*

**3. Заключны этап.**

— Наша спаборніцтва заканчваецца. Давайце падвядзём вынікі. У нашай гульні перамагла каманда… Мы віншуем пераможцаў і ўзнагароджваем іх медалямі. Для ўсіх удзельнікаў гульні мы падрыхтавалі невялічкія сюрпрызы. Дзякуем усім за добрую гульню, за вашы веды! Да новых сустрэч!